УДК 947.608.372(043)

*Дз.М. КІСЯЛЁЎ*

# ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАЙ ВАЕННАЙ УЛАДЫ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*У артыкуле аўтар звяртаецца да адной з маладаследаваных праблем гісторыі Беларусі – жыцця беларусаў ва ўмовах прыфрантавой паласы падчас Першай сусветнай вайны. Разглядаюцца асноўныя моманты палітыкі расійскіх ваенных улад у дачыненні да мясцовага насельніцтва. На аснове аналіза шырокага кола архіўных крыніц аўтар вызначае прынцыпы яе здзяйснення ад самага пачатку вайны, прычыны і фактары яе эвалюцыі. Акрэсліваецца тая роля, якую царскі ўрад адводзіў беларускім губерням у адзначаны перыяд, – поўнае падпарадкаванне мясцовых матэрыяльных і людскіх рэсурсаў патрэбам фронту, без улічэння патрэб і магчымасцей насельніцтва. Паказваюцца рэальныя ўмовы жыцця на тэрыторыі Мінскай ваеннай акругі, вызначаюцца як адмоўныя, так і некаторыя станоўчыя моманты пераходу ўсёй паўнаты ўлады ў рэгіёне ў рукі ваенных у асобе галоўнага начальніка Мінскай ваеннай акругі і ваеннаакруговых упраўленняў.*

Дзейнасць ваеннай улады на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Першай сусветнай вайны ў беларускай гістарыяграфіі асветлена вельмі недастаткова. Асабліва гэта датычыцца праблемы ўзаемаадносін з мясцовым насельніцтвам, а таксама сістэмы забеспячэння рускага фронту ўсім неабходным. Між іншым гаспадарчая дзейнасць расійскіх ваенных і яе вынікі шмат у чым прадвызначылі далейшае не толькі сацыяльна-эканамічнае, але і палітычнае развіццё Беларусі.

З пачаткам вайны Мінская і Магілёўская губерні цалкам, а таксама некаторыя паветы Гродзенскай і Віцебскай увайшлі ў склад створанай 18 ліпеня 1914 г. Мінскай ваеннай акругі на тэатры ваенных дзеянняў.

Тэрыторыя Мінскай ваеннай акругі як тылавога раёна Паўночна-Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў, а потым аднаго Заходняга прызначалася для размяшчэння ўсіх запасаў і тылавых устаноў, якія абслугоўвалі арміі фронта, і для выкарыстання мясцовых сродкаў на патрэбы арміі.

Усе грамадзянскія ўлады на тэрыторыі Мінскай акругі з увядзеннем ваеннага становішча і абвяшчэннем мабілізацыі падпарадкоўваліся галоўнаму начальніку акругі, а ўзаемаадносіны ваенных і грамадзянскіх улад вызначаліся "Правіламі аб мясцовасцях, абвешчаных на ваенным становішчы".

Артыкул 19 "Правілаў..." вызначаў асноўныя правы галоўнага начальніка акругі ў дачыненні да мясцовага насельніцтва. Ён меў права выдаваць абавязковыя пастановы па абароне і захаванні грамадскага парадку і дзяржаўнай бяспекі; перадаваць на разгляд ваеннага суда справы, якія датычыліся дзяржаўнай бяспекі і інтарэсаў арміі; забараняць любыя грамадскія і прыватныя святы і сходы; вызначаць рэжым пражывання, высылаць непажаданых асоб з тэрыторыі акругі; забараняць вываз неабходнага для арміі харчу, фуражу, матэрыялаў ці амуніцыі; зачыняць прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы, а таксама навучальныя ўстановы і перыядычныя выданні; прызначаць рэквізіцыі; прыцягваць мясцовае насельніцтва на абарончыя працы [1]. У дадатак камандуючы акругай меў права прымаць любыя надзвычайныя меры па ахове парадку і ў інтарэсах паспяховага вядзення вайны.

Галоўны абавязак грамадзянскіх улад – садзейнічаць працы ваенных, забяспечваць іх усім неабходным і выконваць усе іх загады, а таксама прадстаў-

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

ляць ваенным дакладныя звесткі аб благанадзейнасці насельніцтва і аб мясцовых матэрыяльных рэсурсах.

"Правілы аб мясцовасцях..." дазвалялі начальнікам паліцыі і жандармерыі рабіць распараджэнні аб папярэднім утрыманні, але не даўжэй чым за два тыдні, усіх асоб, якія выклікаюць падазронасць у здзяйсненні ці дачыненні да злачынства супраць дзяржавы ці арміі. Паліцыя магла рабіць вобыскі ў любы час у любых без выключэння памяшканнях і накладаць арышт на любую маёмасць, якая паказвае на злачыннасць дзеянняў ці намераў.

Насельніцтва акругі за шэраг учынкаў прыцягвалася да адказнасці па законах ваеннага часу. Акруговы ваенны суд разглядаў справы аб дзяржаўнай здрадзе, бунтах ці ўзброеным супраціўленні ўладам; наўмысным псаванні ці знішчэнні ваеннай маёмасці, харчу ці фуражу; пашкоджанні тэлефонных, тэлеграфных ці чыгуначных ліній і водаправодаў; нападах ці забойствах ваеннага ці паліцэйскага. Таксама ў кампетэнцыю ваеннага суда ўваходзілі ўсе крымінальныя справы, здзейсненыя на тэрыторыі акругі і салдатамі, і жыхарамі. За вышэйназваныя злачынствы да вінаватых прымянялася вышэйшая мера пакарання, якую часам змянялі на турэмнае зняволенне ці катаргу.

За дробныя ўчынкі вінаватыя прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці. Напрыклад, "...за дэманстрацыйна-дзёрскі ўчынак..." – за лаянку і абразу афіцэра – штраф 300 рублёў ці 30 сутак арышту; за адмову выхаду на абарончыя працы – штраф 15 рублёў ці 5 сутак арышту; за самавольнае наведванне вайсковага раёна – 50 рублёў ці 14 сутак; за несанкцыяніраваны забой жывёлы – 25 рублёў ці 14 сутак; за гандаль гарэлкай, спіртам, няякаснымі ці сапсаванымі прадуктамі, за спекуляцыю – 3 месяцы турмы; за з'яўленне ў грамадскіх месцах у нецвярозым стане – штраф 25 рублёў. У кожным асобным выпадку меру пакарання – штраф ці турма – абіраў следчы [2].

На асобым кантролі знаходзіліся справы аб шпіянажы. У прыватнай перапісцы забаранялася выкарыстоўваць скарачэнні, умоўныя знакі, шыфры і г. д. З-за гэтага часам здараліся кур'ёзныя выпадкі, асабліва з тэлеграмамі. Так, адзін з уладальнікаў мінскага кінематографа Лейба Гольдберг, які ўжо сваёй нацыянальнай прыналежнасцю прыцягваў увагу, паслаў свайму агенту ў Кіеў тэлеграму: "Лінія смерці шасці Галька трох адказвайце што тэлеграфным пераводам". Такім чынам Гольдберг пытаўся: які фільм – "Лінія смерці" ў шасці частках ці "Галька" ў трох – лепей заказаць і колькі яны каштуюць? Але з-за дзіўнай тэлеграмы Гольдберга арыштавалі і дапрасілі, у яго кватэры зрабілі вобыск, і толькі калі ўсё высветлілася – вызвалілі [3].

Ваенна-акруговае кіраўніцтва здзяйсняла сваю палітыку ў асноўным праз "Абавязковыя пастановы насельніцтву". Яны выдаваліся для ўсёй тэрыторыі акругі альбо для асобных частак і рэгламентавалі ўсё ўнутранае жыццё: рэжым пражывання, правілы ўвозу і вывазу за межы акругі розных тавараў, усю гаспадарчую і камерцыйную дзейнасць, запрашалі на абарончыя працы, тлумачылі парадак забеспячэння войскаў і г. д. За парушэнне "Абавязковых пастаноў..." прадугледжваўся штраф да 3.000 рублёў ці турэмнае зняволенне тэрмінам да трох месяцаў.

Так, напрыклад, быў цалкам забаронены вываз з тэрыторыі акругі буйной і дробнай жывёлы і мяса, а таксама мукі, збожжа, фуражу, будаўнічых матэрыялаў і ўвогуле ўсяго, што ішло на патрэбы войскаў акругі і армій фронту. Нават забаранілі вываз дроў, усе запасы якіх аддаваліся ў распараджэнне чыгункі.

Усе ўладальнікі складоў і магазінаў аптовага гандлю прадметамі першай неабходнасці – зернем, мукой, крупамі, мясам, маслам, соллю, сахарам, гарбатай, рыбай, газам, нафтай і сенам – абавязаны былі 1-га і 15-га дня кожнага месяца

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

паведамляць мясцовай гарадской управе дакладныя звесткі пра колькасць запасаў гэтых прадуктаў. Гандаль павінны былі весці, кіруючыся пастановамі галоўнага начальніка акругі аб часе працы, колькасці тавара і цэнах на яго [4].

Гаспадары магазінаў, складоў і фабрык, якія мелі шарсцяныя і цёплыя рэчы, абутак, валёнкі, ватоўкі, шубы, скуру і сукно шэрага, чорнага і зялёнага колеру, а таксама ўладальнікі аптэк і складоў медыкаментаў і хімічных рэчываў былі абавязаны скласці вопісы гэтай маёмасці і прадставіць іх у гарадскую ўправу. Згодна з імі былі прызначаны памеры абавязковай рэквізіцыі, грошы за якую выплачваліся неадкладна. Калі хто спрабаваў падманваць ці хаваць тавар, то ён падлягаў звычайнаму пакаранню – штраф 3.000 рублёў ці арышт 3 месяцы, а тавар канфіскоўваўся [5].

Ваенныя пільна сачылі за захаваннем на тэрыторыі акругі парадку і грамадскага спакою. Гэтаму пытанню надавалася вельмі сур'ёзнае значэнне, бо акруга з'яўлялася тылавым раёнам фронту і любыя хваляванні маглі адразу адбіцца на паводзінах і настроях салдат. Таму ваенна-акруговае кіраўніцтва неадкладна рэагавала нават на нязначныя праявы незадавальнення, нежадання працаваць і на любыя чуткі, якія хадзілі сярод насельніцтва.

Так, галоўны начальнік распаўсюдзіў на тэрыторыі акругі загад Галоўнакамандуючага Паўночна-Заходняга фронту ад 30 ліпеня 1914 г. па пытанні барацьбы з забастоўкамі і рэвалюцыйным рухам [6]. Загад прадпісваў у выпадку разгару забастовак ці мітынгаў неадкладна прымаць супраць іх самыя жорсткія і рашучыя захады: на чыгунцы – пасылаць на падаўленне баявыя цягнікі, на прадпрыемствах – арыштоўваць як мага болей зачыншчыкаў і судзіць іх ваенна-палявымі судамі. Рабіць так, каб выключыць магчымасць працягу і паўтарэння выступленняў.

Галоўным абавязкам мясцовага насельніцтва было забеспячэнне войскаў акругі і войскаў фронту ўсім неабходным, у першую чаргу харчам і фуражом. Здзяйснялася гэтае забеспячэнне ў асноўным праз прымусовыя рэквізіцыі. За рэквізаваную маёмасць сяляне атрымлівалі кампенсацыю ў межах сярэдніх рынкавых цэн. У склад рэквізіцыйнай камісіі ўваходзілі прадвадзіцель павятовага дваранства (старшыня), павятовы іспраўнік, падатковы інспектар, земскі начальнік (там, дзе былі земствы), ветэрынарны ўрач і некалькі мясцовых жыхароў па меркаванні камісіі.

Рэквізіцыі падлягалі валы, каровы і быкі ва ўзросце ад 2 да 12 год, вагай не меней 12 пудоў. Жывёлы павінны быць здаровымі, не худымі, здольнымі самастойна перамяшчацца, не хварэць яшчурам, каростай і інш., без прыкмет туберкулёзу. Сялянам пакідалі аднаго каня, адну карову і 20% маладняку. У памешчыкаў пакідалі пару коней на кожныя 12 дзесяцін пашы, адну карову на 5 дзесяцін такой жа зямлі і 20% маладняку.

Рэквізіцыі падлягалі і кармы. Пакідалі кармоў у разліку: на каня – 10 фунтаў сена, 5 фунтаў жытняй саломы і 10 фунтаў жытняй мукі ў дзень з правам замены мукі на авёс; на карову – 10 фунтаў сена і 20 фунтаў саломы ў дзень; на маладняк – палову нормы. На дробную жывёлу пакідалі па 5 фунтаў сена і саломы ў дзень. Тэрмін разліку кармоў – да 15 мая. Усю жывёлу, фураж і кармы вышэй за норму і тэрмін рэквізаваліся.

Ад рэквізіцый вызвалялася цяжарная і племянная жывёла, а таксама гаспадаркі, якія ўжо прынялі жывёлу на ўтрыманне па распараджэнні ваенных улад ці гадавалі малочную жывёлу ў 30-верставым раёне ад буйнейшых гарадоў і цэнтраў размяшчэння войскаў – Мінска, Магілёва, Оршы, Гомеля і інш. [7].

Аналагічную аперацыю правялі восенню 1916 г. ужо па рэквізіцыі запасаў гародніны, бо мяса, малако і збожжа былі амаль цалкам рэквізаваны яшчэ ў 1914 – 1915 гг. і акруговае кіраўніцтва было вымушана зрабіць садавіну і гарод-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ніну асноўнымі відамі харчовага забеспячэння войскаў. Для вызначэння запасаў гародніны ўсё без выключэння насельніцтва акругі павінна было прадставіць звесткі аб запасах бульбы, капусты, буракоў, лука, часнаку і морквы. Устанаўлівалася норма на аднаго едака на год: 18 пудоў бульбы, усёй астатняй гародніны – па 60 залатнікоў у дзень. Дзяцям да 5 год уключна – палова нормы. На насенне – 120 пудоў бульбы на 1 дзесяціну. На корм жывёле – 15 пудоў на год на адну свінню. Лішкі, калі яны ў каго-небудзь заставаліся, падлягалі рэквізіцыі па цэнах, не вышэй за межавыя, вызначаныя галоўным начальнікам акругі. Тыя, хто хаваў лішкі ці паведамляў аб іх несвоечасова, падвяргаліся штрафу. Калі сяляне адмаўляліся здаваць гародніну па вызначаных цэнах дабраахвотна, тады праводзілася прымусовая рэквізіцыя на 5% танней [8].

Сярод асноўных і найбольш важных абавязкаў насельніцтва Мінскай ваеннай акругі была падводавая павіннасць, бо пастаянна прыходзілася перамяшчаць на тэрыторыі акругі вялікую колькасць грузаў для забеспячэння армій фронту. Былі нават распрацаваны спецыяльныя "Правілы спагнання падводаў для патрэбаў арміі". За выкарыстанне падводаў прызначалася пэўная плата, паўторнае спагнанне не дапушчалася, забеспячэнне каня фуражом, а гаспадара – харчам пры выкананні павіннасці клалася на ваенныя ўлады ў адпаведнасці з армейскімі нормамі. Гаспадару выдавалася пасведчанне – што, дзе, калі, куды і кім спагнана. Аплачваліся гэтыя пасведчанні наяўнымі грашамі праз валасныя ўправы. Начальнік штаба акругі загадаў губернатарам праз земскіх начальнікаў давесці гэтыя правілы да сялян, каб пазбегнуць непаразуменняў і перашкод у практычнай дзейнасці. Аднак часта сяляне непасрэдна звярталіся ў штаб за сваімі грашыма, бо атрымаць іх ва ўправах было вельмі складана [9].

Акрамя гэтага, мясцовыя сяляне актыўна выкарыстоўваліся на разнастайных працах абарончага характару: на будаўніцтве ці рамонце дарог, мастоў, рэек, расчыстцы тэрыторый, рыцці акопаў і ўзвядзенні інжынерных пабудоў. Асабліва інтэнсіфікаваўся гэты працэс з лета 1915 г., калі фронт наблізіўся непасрэдна да межаў Мінскай акругі. Часам здаралася так, што адных і тых жа сялян "выпісвалі" на працу адразу і ваенныя, і грамадзянскія ўлады, з-за чаго адбываліся спрэчкі, а сялянам не было калі займацца сваімі асабістымі справамі. Каб пэўным чынам упарадкаваць становішча, 15 лістапада 1915 г. Галоўнакамандуючы Заходняга фронту зацвердзіў "Правілы аб парадку збора рабочых ад мясцовага насельніцтва, выклікаемых на абарончыя працы".

Але гэта не палепшыла справу арганізацыі абарончых работ. У канцы лістапада 1915 г. галоўны начальнік акругі генерал Я.А. Раўш-фон-Траўбенберг запатрабаваў ад грамадзянскіх улад даслаць на працы па ўмацаванні Бабруйскай крэпасці 400 рабочых і 200 падводаў на 4 тыдні. Бабруйскі павятовы іспраўнік размеркаваў гэты нарад на бліжэйшыя 5 валасцей, аднак людзей прыслалі толькі з адной. Астатнія абмежаваліся складаннем спіса сялян, якія павінны прыйсці на працы, з тлумачэннем, што сяляне адмовіліся. Гэта значыць, вам патрэбны людзі – вы шукайце і прымушайце іх.

З другога боку, самі ваенныя вельмі дрэнна падрыхтаваліся да работ. Як высветліла праверка, забеспячэнне сялян было нездавальняючым: інструментаў і лапат не было, людзей не папярэдзілі, што патрэбны падводы на калёсах, а не сані, і інш. А напрыканцы яшчэ і не заплацілі [10].

Праверка сялян, прысланых на абарончыя працы ў сакавіку 1916 г., прынесла тыя ж самыя вынікі. Адзенне, абутак і бялізна людзей былі ў нездавальняючым стане, часта прысылаліся фізічна не здольныя на цяжкія акопныя і будаўнічыя працы людзі, забеспячэнне харчам і фуражом было дрэнным, нярэдка былі падманы ў аб'ёмах працы і зарплаце [11].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Аднак сяляне, асабліва памежных з вайсковым раёнам паветаў, у большасці сваёй добраахвотна ўдзельнічалі ў абарончых працах, разглядаючы іх як вельмі добры сродак зарабіць грошы. Нярэдка адмаўляліся ад апрацоўкі зямлі, бо працы прыносілі больш прыбытку.

Паказальны тут рапарт пінскага павятовага іспраўніка ад 7 студзеня 1916 г.: "Настроение населения в незанятой неприятелем части уезда подавленное и отчасти тревожное из-за опасения, что неприятель будет продвигаться вперед и займет весь уезд. Крестьяне лишь в малой части заняты своими домашними работами, сельскохозяйственная жизнь совершенно расстроена, осталась лишь забота о средствах прокормления себя, своего скота и лошадей... Но наряду с этим крестьянское благосостояние повысилось (!), и денежные сбережения увеличились от заработков при работах по возведению укреплений, устроительству окопов, дорог и других сооружений, выполняемых по требованию военного начальства за хорошую для здешней местности плату..." [12].

Для параўнання – сярэдні заробак чорнарабочага ў гэты час на абарончых працах у дзень складаў 2 рублі, спецыяліста – 4 рублі. Плата за выкананне падводавай павіннасці за суткі за аднаконную падводу з рабочым – 3 рублі, без рабочага – 1,5 рублі, параконную, адпаведна, – 5 і 3,5 рублі (пры цэнах за фунт хлеба – 12 капеек, за кілаграм свініны – 50 капеек, за пуд бульбы – 60 капеек) [13].

Нядрэнныя грошы атрымлівалі сяляне і за рэквізаваных па ваенна-конскай павіннасці коней. Па цэнах на чэрвень 1916 г. ваенныя плацілі за другаразраднага каня да 150 рублёў і да 375 рублёў – за коней верхавога сорту [14].

Значнай праблемай для мясцовага насельніцтва заставалася інфляцыя, з аднога боку, і ўвядзенне абмежавання на рост цэн і аб'ёмы куплі-продажу асноўных тавараў, з другога.

Па некалькі разоў на год галоўны начальнік акругі сваім загадам зацвярджаў рубежныя цэны і нормы продажу тавараў. Безумоўна, такое становішча параджала дэфіцыт і спекуляцыю, і хаця са спекулянтамі змагаліся вельмі жорстка, рэальныя цэны для мясцовага насельніцтва былі значна вышэй.

Інфляцыя на асноўныя харчовыя тавары толькі за першыя два гады вайны склала прыкладна 20–30% на цукар і малако, 50% на бульбу і крупы, больш за 70% на хлеб і муку, і нават да 140% на свініну і сала [15].

Відавочна, што палітыка ваенна-акруговага кіраўніцтва ў дачыненні да мясцовага насельніцтва грунтавалася на прынцыпе поўнага падпарадкавання мясцовых сродкаў патрэбам фронту. У прыфрантавой паласе размяшчаліся рэзервовыя і запасныя часткі, усе тылавыя ўстановы. Насельніцтва павінна было забяспечваць войскі акругі і фронту ўсім неабходным: выконваць конскую і падводавую павіннасці, працаваць на абарончых работах, здаваць праз прымусовыя рэквізіцыі харч і фураж. Пры гэтым на асабістыя інтарэсы жыхароў увагі амаль не звярталася. Царскі ўрад бачыў у беларускіх губернях толькі сродак задавальнення патрэб арміі. Для забеспячэння парадку і грамадскага спакою на тэрыторыі акругі ўводзіўся даволі жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым, падаўляліся ўсе спробы выказаць свой пратэст.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Правила о местностях, объявленных состоящими на военном положении. – Петроград, 1914.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 9216а, 9465, 9466. Справы аб налажэнні адміністрацыйнага пакарання за парушэнне абавязковых пастаноў галоўнага начальніка Мінскай ваеннай акругі.
3. НГАБ. – Фонд 300. – Воп. 1. – Спр. 67. – Арк. 1-312. Справаздачы мінскага паліцмейстэра.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

4. НГАБ. – Фонд 300. – Воп. 1. – Спр. 65. – Арк. 301. Справаздача мінскага паліцмейстэра.
5. Обязательное постановление для населения Минского военного округа // Минские губернские ведомости. – 1914. – 8 сентября. – С. 1.
6. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 8591б. – Арк. 245-246. Перапіска мінскага губернатара з галоўным начальнікам мінскай ваеннай акругі па адміністрацыйных і гаспадарчых пытаннях.
7. НГАБ. – Загады Мінскім ваенна-акруговым упраўленням на тэатры вайны. № 904 ад 28 лістапада 1915 г.
8. НГАБ. – Абавязковая пастанова для насельніцтва Мінскай ваеннай акругі ад 25 кастрычніка 1916 г.
9. НГАБ. – Фонд 299. – Воп. 1. – Спр. 16024. – Арк. 151-152. Перапіска з начальнікам штаба акругі па гаспадарчых пытаннях.
10. Там жа. – Арк. 14-15, 36.
11. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 9178. – Арк. 272. Скаргі насельніцтва на дзеянні ваенных уладаў.
12. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 9184. – Арк. 19-20. Рапарты павятовых ісправнікаў мінскаму губернатару аб становішчы ў паветах.
13. Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА). – Фонд 1927. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 1-10. Ведамасць цэнаў на прадметы першай неабходнасці па Мінскай губерні за 1914-1916 гг.
14. НГАБ. – Загады Мінскім ваенна-акруговым упраўленням на тэатры вайны. № 360 ад 25 чэрвеня 1916 г.
15. НГАБ. – Загады Мінскім ваенна-акруговым упраўленням на тэатры вайны. № 5 ад 7 студзеня 1916 г.


Паступіў у рэдакцыю 25.05.2006.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова